Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Очень интересно отметить, что изготовитель закладок не был столь аккура-ен при ее изготовлении. Она выполнена несколько небрежно: игла не всегда овторно проходила в одно и то же отверстие. Такой стиль шитья аккуратен. )быденность выполнения цикличной и механической работы приводил к тому, то человек совершал технологические ошибки. Например, прокалывал лист умаги повторно.

ЛИТЕРАТУРА

1. **Ковалевский, А. П.** Описание восточных рукописей Центральной научной биб-иотеки Харьковского государственного университета / А. П. Ковалевский // Библиогра-ия Востока. – 1934. – Вып. 7. – С. 93–115.

2. **Ковалівський, А.** Вивчення Сходу в Харківському університеті та Харкові у VIII–XX ст. / А. Ковалівський // Антологія літератур Сходу / під ред. А. Ковалівського. – . 9–122.

3. **Челеби Кятиб.** Джихан-нюма / Кятиб Челеби // Восточная литература Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/rus17/Celebi_Katib [I/frametext1.htm. – Дата доступа: 02.03.2016.

4. **Челеби Эвлия.** Книга путешествий (Сейахатнаме). Земли Закавказья и сопре-ельных областей Малой Азии и Ирана / Эвлия Челеби // Восточная литература [Элект-онный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/rus10/Celebi4/text10.phtml d=1745. – Дата доступа: 02.03.2016.

*Among the unique artefacts kept in the collection of the Central Science Library ıere are two Ottoman defters. While conducting routine artefact state monitoring our ttention was drawn to one of the defters (code 173-c). The detailed description of the riental manuscripts of the libraries has the following description of this manuscript nscription on the cover): «New consolidated registry (defter) of Hekesh sanjak (with vo Fahts), Salazkird sanjak with Takman sanjak that falls on the year nine hundred ine and a hundred from the Hijra of the Prophet (blessings follow)». The object of ır study became some textile details of the manuscript and ink inclusions.We found ıat the defter has 4 bookmarks of natural silk dyed with natural dyes (madder, reseda, ırmeric, indigo).*

***Жук Т.І.*** *(Мінск)*

## СВЯТАР ВІКТАР ШУТОВІЧ І ЯГО РУКАПІСЫ Ў ФОНДАХ АДДЗЕЛА РЭДКІХ КНІГ І РУКАПІСАЎ ЦНБ НАН БЕЛАРУСІ

У аддзеле рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі поруч з найбагацейШымі калекцыямі рэдкіх і коштоўных кніг захоўваецца больш за 60 фондаў асабістага паходжання вядомых беларускіх вучоных, пісьменнікаў, грамадскіх і культурных дзеячаў, якія ўнеслі значны ўклад у развіццё беларускай навукі і



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

культуры, а таксама асобныя каштоўныя, шмат у чым унікальныя, гістарычныя дакументы XVI–XX стст. Рукапісныя фонды выклікаюць усё больш вялікую цікавасць з боку вучоных і даследчыкаў, яны з'яўляюцца ўнікальнай інфармацыйнай крыніцай пры стварэнні найбольш поўнага і аб'ектыўнага вобраза той ці іншай асобы, садзейнічаюць вывучэнню і раскрыццю яго творчай ці навуковай дзейнасці, якая ў сваю чаргу адлюстроўваецца ў асабістых архівах.

У склад рукапіснага фонду аддзела ўключана «Коллекция материалов по истории, науке и культуре» (фонд 23), дзе ў адным з раздзелаў сабраны разам дробныя асабістыя фонды вядомых грамадска-палітычных і культурных дзеячаў: З. Верас, А. Вінара, В. Ластоўскага, Ю. Сергіевіча, А. Смоліча, У. Талочкі, А. Уласава і інш. Сярод іх і рукапісы беларускага святара Віктара Шутовіча (1890–1960), якога, безумоўна, можа далучыць да тых адметных постацей XX ст., якія стаялі ля вытокаў духоўнага адраджэння беларускага народа.

В. Шутовіч нарадзіўся ў в. Шутавічы Ашмянскага павета Віленскай губерні (цяпер Смаргонскі раён Гродзенскай вобл.) у шматдзетнай сялянскай сям'і. Бацькі, якія былі пісьменнымі, намагаліся даць усім дзецям адукацыю, у тым ліку і Віктару, які набываў пачатковыя веды ў Ашмянскай школе. Вучобу ён працягнуў у Віленскай каталіцкай духоўнай семінарыі, дзе вучыліся будучыя вядомыя дзеячы беларускага нацыянальнага руху А. Станкевіч, Я. Germановіч, К. Сваяк і інш. У семінарыі А. Станкевічам быў арганізаваны беларускі гурток, дзе сябрамі-аднадумцамі, сярод якіх быў і будучы святар В. Шутовіч, абмяркоўваліся пытанні, звязанныя з беларускім нацыянальным адраджэннем.

Напрыканцы 1913 г. Шутовіч быў пасвячоны ў святары.

У 1914 г. В. Шутовіч працягнуў адукацыю ў Пецярбургскай духоўнай акадэміі. Тут ён далучыўся да прагрэсіўнай беларускай моладзі з ліку студэнтаў Пецярбургскага ўніверсітэта і беларускага гуртка пры духоўнай акадэміі, пазнаёміўся са многімі дзеячамі, што стаялі ля вытокаў беларускага адраджэнскага руху.

Падчас вучобы ва ўніверсітэце юнак не забываўся пра родную вёску, наведваў на канікулах бацькоў, падтрымліваў сувязь з моладдзю, якую заахвочваў да чытання беларускіх кніжак і газет.

У роднай вёсцы ладзіліся беларускія вечарыны, ставіліся п'есы, для якіх В. Шутовіч рыхтаваў увесь песенны рэпертуар. Маючы добры музычны слух і валодаючы прыемным голасам, ён сам артыстычна выконваў беларускія песні і нават арганізаваў у вёсцы харавы калектыў [3, с. 2–3].

У 1916 г. В. Шутовіч з-за матэрыяльных прычын быў вымушаны спыніць далейшую вучобу. Некаторы час выконваў абавязкі вікарыя пры Красненскім касцёле, а ў 1917 г. быў накіраваны пробашчам у в. Барадзенічы Браслаўскага павета, дзе напрацягу 10 гадоў беларускі святар паспяхова спалучаў сваё духоўнае прызначэнне з актыўнай грамадскай і культурна-асветніцкай працай. Ён арганізававаў беларускі дзіцячы прытулак і пры ім школу, дзе дзеці набывалі пачатковыя веды. Ксёндз Шутовіч заснаваў некалькі беларускіх пачатковых школ, у якіх сам выкладаў рэлігію, а на курсах арганістаў вучыў моладзь арганнай музыцы. Распачалася паступовая беларусізацыя Барадзеніцкага касцёла:



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

В. Шутовіч пачаў ужываць беларускую мову ў казаннях і дадатковых набажэнствах, касцёльныя запісы вяліся на роднай мове, нават песні ў выкананні касцёльнага хору гучалі па-беларуску. Неаднойчы ў Барадзенічах адбываліся з'езды беларускага духавенства. За сваю дзейнасць святар праследаваўся польскімі духоўнымі і свецкімі ўладамі, некалькі разоў быў пад следствам. У 1927 г. В. Шутовіч па загадзе віленскага мітрапаліта быў пераведзены вікарыям у Ліду, потым – у польскі прыход у Тшцяны. З 1929 г. быў вымушаны выехаць за мяжу ў ЗША, дзе займаўся перакладамі на родную мову рэлігійнай літаратуры, пісаў артыкулы. Вярнуўшыся ў 1932 г. на радзіму, быў прызначаны вікарыям у м. Харошчы пад Беластокам. У гэты перыяд свайго жыцця В. Шутовіч далучыўся да літаратурнаяй працы, пісаў артыкулы, прысвечаныя беларускім святам, апавяданні, драматычныя творы; ён аўтар драмы «950 гадоў хрысціянства на Беларусі» [1]. У 1940 г. у Вільне асобнай кніжкай выйшла яго «Маёвая чытанка» [5].

Падчас нямецка-фашысцкай акупацыі ён нейкі час працаваў у Мінску ў Катэдральным касцёле, потым служыў у Чырвоным касцёле. У 1945 г. Шутовіч быў арыштаваны і асуджаны на 10 гадоў папраўча-працоўных лагераў. Вярнуўшыся на бацькаўшчыну ў 1955 г., ён спачатку працаваў пад Мінскам, а з 1956 г. служыў святаром у Барысаве. В. Шутовіч пайшоў з жыцця ў 1960 г., пахаваны на мясцовых могілках.

На жаль, захавалася не вельмі шмат дакументаў, якія склалі асабісты фонд беларускага святара В. Шутовіча. Дакладны час паступлення рукапісаў у ЦНБ НАН Беларусі не ўстаноўлены, але можна меркаваць, што яны былі перададзены ў аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў яго пляменнікам Янкам Шутовічам у пачатку 1970-х гг., альбо трапілі разам з яго архівам, набытым бібліятэкай у 1974 г. пасля смерці пляменніка. Апрацаваныя дакументы складаюць 10 спраў, уключаюць 607 дакументаў за 1917–1960 гг. і сістэматызаваны ў храналагічным парадку (ф. 23, воп. 1, адз. зах. 844–853).

Самы ранні дакумент калекцыі – запрашэнне на ўдзел В. Шутовіча ў рабоце Першага з'езда беларускіх ксяндзоў (адз. зах. 844), які адбыўся ў Мінску ў 1917 г. і на якім была заснавана Беларуская хрысціянская дэмакратычная злучанасць (БХД).

Рапарты, данясенні, лісты, заявы і іншыя дакументы адносна звальнення ксяндза В. Шутовіча з пасады пробашча Барадзеніцкага касцёла за вядзенне службы на беларускай мове і перавод вікарыям у Ліду і Тшцяны складаюць асобную справу, датаваную 1924–28 гг. (адз. зах. 845).

У калекцыі захоўваюцца дакументы біяграфічнага і асабістага характару: выпіска з метрычнай кнігі пра нараджэнне і хрышчэнне В. Шутовіча, датаваная 23 ліпеня 1928 г., лісты ў пракуратуру СССР адносна перагляду яго судовай справы, бланк на абмен пашпарта, запоўнены Шутовічам з яго фотаздымкам, копія пратакола вобыску, які праводзіўся ў 1959 г., заявы ў розныя ўстановы па рэлігійна-культавых і асабістых пытаннях за 1955–59 гг. (адз. зах. 848, 849). Найбольш аб'ёмная справа ўключае ў сябе 6 агульных і 6 вучнёўскіх сшыткаў з


Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

тэкстамі казанняў і іншымі запісамі, якія адкладаліся падчас рэлігійнай службы святара ў Барысаве ў 1956–59 гг. (адз. зах. 850).

Эпісталярная спадчына В. Шутовіча прадстаўлена лістамі за 1926–1930 гг. са зваротамі «Даражэнькі» і «Дарагі», якія, мяркуючы па змесце, магчыма, былі адрасаваны Адаму Станкевічу (адз. зах. 847) і лістамі да Шутовіча розных асоб за 1958–1960 гг. (адз. зах. 852). Акрамя гэтага, у фондзе захоўваецца рукапіс водгуку В. Шутовіча за 25 красавіка 1926 г., надрукаваны ў газеце «Беларуская крыніца» (1926, № 13), артыкул «Час абнавіцца» (адз. зах. 846), верш-прысвячэнне святару ад барысаўскіх прыхаджан са зваротам «Czcigodny Ojcze duchowny!» (адз. зах. 851) і газетная выразка артыкула С. Нортмана «Мараль пана прабошча» з асуджэннем святарскай дзейнасці ксяндза В. Шутовіча ў Барысаве (адз. зах. 853).

Трэба адзначыць, што цэласнае ўяўленне пра рукапісную спадчыну той ці іншай гістарычнай постаці дае не толькі яго асабісты фонд, але і асобныя дакументы пра дзейнасць уладальніка архіва, якія вельмі часта знаходзяцца ў складзе іншых асабістых фондаў і калекцый і высвятляюцца толькі пры дэталёвым вывучэнні яго біяграфіі.

«Коллекция материалов по истории, науке и культуре» не адзіны фонд у ЦНБ НАН Беларусі, дзе захоўваюцца дакументы В. Шутовіча. Так, матэрыялы святара выяўлены ў фондах беларускага грамадскага і культурнага дзеяча, літаратуразнаўца Янкі Шутовіча (1904–1973) (фонд 1), беларускага гісторыка, публіцыста, кнігавыдаўца, асветніка, грамадска-палітычнага дзеяча Адама Станкевіча (1892–1949) (фонд 4) і беларускага грамадскага дзеяча, публіцыста, выдаўца Адольфа Клімовіча (1900–1970) (фонд 5).

У склад архіўнага фонда Я. Шутовіча ўвайшлі наступныя дакументы, якія тычацца яго дзядзькі ксяндза В. Шутовіча: машынапісы апавядання «Чаму ён не жэніцца», п'есы «Вясковае здарэнне», датаваныя 1936 г., і артыкул «Краснае пісьменства» (ф. 1, воп. 1, адз. зах. 366) з паметай: «Хорошч 3.XII.38.». Мяркуючы па запісе на апошняй старонцы, гэтыя літаратурныя творы з мэтай магчымай публікацыі былі перададзены Я. Шутовічу, які ў 1935–39 гг. быў адказным рэдактарам і выдаўцом аднаго з самых вядомых заходнебеларускіх перыядычных выданняў – літаратурна-навуковага часопіса «Калосьсе». Асобную справу складаюць вельмі каштоўныя фотаздымкі В. Шутовіча розных гадоў, якіх увогуле захавалася няшмат. Сярод іх – цікавы і рэдкі здымак юнака з сябрам часоў вучобы ў Смаргонскім вучылішчы ў пачатку XX ст. (адз. зах. 327, л. 1). Перапіска сваякоў прадстаўлена паштоўкай з Харошчаў (адз. зах. 231), у якой В. Шутовіч, між іншым, звяртаецца да пляменніка з просьбай даслаць нотную бумагу для запісаў беларускіх песень і лістамі Я. Шутовіча ў Барысаў асабістага характару (адз. зах. 165, л. 3, 8, 9). Прывітальнае слова Я. Шутовіча на святкаванні 70-годдзя з дня нараджэння дзядзькі (адз. зах. 382), у якім адзначаны асноўныя вехі біяграфіі юбіляра, безумоўна, з'яўляецца крыніцай для выяўлення раней невядомых фактаў пра жыццё і дзейнасць беларускага святара.



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by

Дзве справы са звесткамі пра В. Шутовіча захоўваюцца і ў фондзе А. Клімовіча. «Аб ксяндзу Шутовічу канкрэтна я дачуўся ўпершыню ў 1919 г. ад яго пляменніц у Вільні і таму ў маім разуменні паняцці «кс. Шутовіч» і «дзядзька» сталіся сінонімамі», – успамінаў А. Клімовіч [4, л. 1]. На жаль, канчатак, як і дакладная дата напісання гэтых вельмі цікавых успамінаў адсутнічае, але, мяркуючы па тэксце на апошняй старонцы, дзе Клімовіч апісвае свой прыезд у Барысаў да В. Шутовіча пасля рэабілітацыі ў 1957 г. і па запісе на першай старонцы рукапісу «Кс. Віктар Шутовіч памёр», дакумент можна датаваць 1959–1960 гг.

А. Клімовіч вядомы як складальнік біяграфічнага слоўніка беларускіх культурных і палітычных дзеячаў. Матэрыялы да яго захаваліся ў выглядзе спіска і картатэкі з кароткімі біяграфічнымі звесткамі пра беларускіх дзеячаў, у тым ліку і пра ксяндза В. Шутовіча (ф. 5, воп. 1, адз. зах. 1, л. 328).

У складзе асабістага фонду А. Станкевіча таксама выяўлены дакументы пра ксяндза В. Шутовіча: рапарты, данясенні, лісты, заявы і іншыя матэрыялы адносна яго звальнення з пасады пробашча Барадзеніцкага касцёла і ўжывання беларускай мовы ў набажэнствах; кароткая аўтабіяграфія Шутовіча; старонка газеты «Беларуская крыніца» ад 21 студзеня 1927 г. з артыкулам у абарону святара (ф. 4, воп. 1, адз. зах. 109, л. 10), дзе акрамя ідэй захавання духоўных каштоўнасцей беларусаў падаецца яго жыццяпіс. Аўтарам артыкула «Krуčač cajanie sprawiadliwaść» мае падставы лічыцца А. Станкевіч, які ў 1927 г. друкаваўся ў газеце «Беларуская крыніца» ананімна з-за пагрозы адлучэння яго ад Касцёла [2, с. 32].

Каштоўная рукапісная спадчына святара В. Шутовіча, што захоўваецца ў фондзе аддзела рэдкіх кніг і рукапісаў ЦНБ НАН Беларусі, дае больш поўнае ўяўленне пра жыццё і дзейнасць аднаго са слаўных дзеячаў беларускага нацыянальнага адраджэння. Яна з'яўляецца крыніцазнаўчай базай для вучоных і даследчыкаў, садзейнічае вывучэнню ролі каталіцкага беларускага духавенства ў беларускім адраджэнскім руху.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Виктор Шутович** [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: cycloniki.org/wiki/Виктор Шутович. – Дата доступу: 12.02.2016.

2. **Конан, У.** Ксёндз Адам Станкевіч і каталіцкае адраджэнне ў Беларусі / Уладзімір Конан. – Мінск : Про Хрысто, 2003. – 127 с.

3. **Цэнтральная** навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 1. – Воп. 1. – Адз. зах. 382.

4. **Цэнтральная** навуковая бібліятэка імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Аддзел рэдкіх кніг і рукапісаў. – Ф. 5. – Воп. 1. – Адз. зах. 131.

5. **Šutovič, V.** Majovaja čytanka / ks. V. Šutovič. – Vilnius, 1940. – 160 s.

*The article provides the analysis of content of the manuscript fund of one of the representatives of the Belorussian national movement of the first half of the 20$^{th}$ century – priest Victor Shutovich, the archival documents on his life and activity, which are stored in the funds of personal origin of other persons, are introduced into scientific circulation.*



Репозиторий ЦНБ НАН Беларуси - http://library.basnet.by